Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ»

# ХРЫСЦІЯНСТВА Ў ГІСТАРЫЧНЫМ ЛЁСЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

Зборнік навуковых артыкулаў

У 2 частках

Час а 1

Гродна
ГрДУ імя Я. Купалы
2009

Репозиторий БарГУ

УДК 27(476)
ББК 86.37
Х95

Рэдакцыйная калегія:

*С.В. Марозава,* доктар гістарычных навук, прафесар;
*Э.С. Ярмусік,* кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*С.У. Сілава,* кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Рэцэнзенты:

*Галубовіч В.У.,* кандыдат гістарычных навук, дацэнт;
*Васюк Г.У.,* кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

**Хрысціянства** ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб.
Х95 навук. арт. У 2 ч. Ч. 1 / ГрДУ імя Я. Купалы ; рэдкал.: С.В. Марозава [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2009. – 385 с.
ISBN 978-985-515-244-7 (ч. 1)
ISBN 978-985-515-241-6 (общ.)

У аснову зборніка пакладзены матэрыялы II і III міжнародных навуковых канферэнцый «Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа», а таксама круглага стала, прысвечанага 170-годдзю Полацкага царкоўнага сабора 1839 г., якія былі праведзены ў 2008 і 2009 гадах у межах выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006 – 2010 гг. «Эканоміка і грамадства», раздзел «Філасофія» (галаўная арганізацыя – Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут філасофіі НАН Беларусі»). Разглядаецца роля хрысціянскіх культавых інстытутаў у духоўна-культурным, грамадска-палітычным і этнанацыянальным жыцці беларускага народа ў канцы Х – пачатку ХХ ст., а таксама тэарэтыка-метадалагічныя падыходы і гістарыяграфія гэтай праблемы. Адрасаваны даследчыкам, выкладчыкам, аспірантам, магістрантам і студэнтам, настаўнікам, аматарам гісторыі Беларусі.

**УДК 27(476)**
**ББК 86.37**

**ISBN 978-985-515-244-7 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-515-241-6 (общ.)**

© Установа адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны універсітэт
імя Янкі Купалы», 2009

Репозиторий БарГУ

Периодическая смена доминирующих подходов к определению роли учебных заведений ордена в данном процессе была следствием изменений в общественно-политических и социокультурных условий, в которых формировалось мировоззрение разных поколений польских учёных. Общей тенденцией в изучении ими этой проблемы является постепенная эволюция от доминирования осуждающих и отрицательных точек зрения к вполне уравновешенным и лояльным в отношении ордена позициям.

*Список источников и литературы*


1. Bartoszewicz, J. Historia literatury polskiej potocznym sposobem opowiedziana / J. Bartoszewicz // Dzieła. – T. II. – Kraków, 1877.
2. Bentkowski, F. Historia literatury polskiej / F. Bentkowski. – T. 1. – Warszawa-Wilno, 1814.
3. Bobrzyński, M. Dzieje Polski w zarysie / M. Bobrzyński. – Warszawa, 1879.
4. Bruckner, A. Obrazki staroszlacheckie / A. Bruckner // Biblioteka Warszawska. – 1896. – T. IV.
5. Baliński, M. Historya Kosciola polskiego / M. Baliński. – T. III. – Kraków, 1874.
6. Chlebowski, B. Rozwój kultury polskiej w tresciowym zarysie przedstawiony / B.Chlebowski. — Warszawa-Lublin-Lodz, 1917.
7. Gajsiorowski, L. Zbór wiadomości do historyi sztuki lekarskiej w Polsce od czasów najdawniejszych, az do najnowszych / L. Gajsiorowski – T. 1. – Poznań, 1839.
8. Grabski, A.F. Zarys historii historiografii polskiej / A.F. Grabski. – Poznań, 2000.
9. Jekl, F. J. O Polszcze, iej dzieiach i konstytucyi: dzieło / F. J. Jekl. – Cz. 2. – Lwów, 1819.
10. Kardaszewicz, S. Dzieje dawniejsze miasta Ostroga / S. Kardaszewicz. – Kraków, 1913.
11. Koronowicz, W. Słowo dziejów polskich / W. Koronowicz. – Lipsk, 1858. – T. 2.
12. Korzon, T. Wewnętrzne dzieje Polski za Stanisława Augusta (1764 – 1794) / T. Korzon. – T. 1. – Kraków, 1897.
13. Krzyżanowski, A. Dawna Polska / A. Krzyżanowski. – Warszawa, 1844.
14. Kwiatkowski, K. Dzieje narodu polskiego za panowania Władysława IV, króla polskiego i szweckiego / K Kwiatkowski. – Warszawa, 1823.
15. Lukaszewicz, J. Historya szkoł w Koronie i w Wielkiem Księstwie Litewskiem od najdawniejszych czasów az do roku 1794 / J. Lukaszewicz. – Poznań, 1849. – T. 1.
16. Mecherzyński, K. Historya języka łacinskiego w Polsce / K. Mecherzyński. – Kraków, 1833.
17. Morawski, T. Dzieje narodu polskiego / T. Morawski. – T. IV: Królowie obierani. Sasi. – Poznań, 1877.
18. Muczkowski, J. Bractwa jezuickie i akademickie w Krakowie / J. Muczkowski. – Kraków, 1845.
19. Niemcewicz, J. U. Dzieje panowania Zygmunta III, krola Polskiego, Wielkiego Xięcia Litewskiego, Ruskiego, Pruskiego, Mazowieckiego, Zmudzkiego, Kijowskiego, Wołyńskiego, Podolskiego, Podlaskiego, Smoleńskiego, Siewierskiego, Inflantskiego i Czerniechowskiego, dziedzicznego króla Gotów i Wandałów / J. U. Niemcewicz. – T. III. – Warszawa, 1819.
20. Piśma Bronisława Chlebowskiego. – T. 1. – Warszawa, 1912.
21. Rembowski, A. O stosunku państwa do oswiaty narodowej / A. Rembowski. – Warszawa, 1875.
22. Schmitt, H. Rokosz Zebrzydowskiego / H. Schmitt. – Lwów, 1858.
23. Smoleński, W. Przewrót umysłowy w Polsce wieku XVIII / W. Smoleński. – Warszawa, 1923.
24. Starczewski, E. Moznowladztwo polskie na tle dziejów do końca XVII w. / E.Starczewski. – T. 1. – Warszawa, 1914.
25. Szczepański, A. Szkoły i wychowanie w Polsce / A. Szczepański. – Poznań, 1873.
26. Szujski, J. Dzieje Polski podług ostatnich badań / J. Szujski. – T. 3. – Lwów, 1864.
27. Tarnowski, S. Historya literatury polskiej wieku XVII-go / S. Tarnowski. – Warszawa, 1906.
28. Zalęski, S. Jezuici w Polsce. – T. 1: Walka z różnowierstwem 1555 – 1608 / S. Zalęski. – Lwów, 1900.


**Серяков Сергей Олегович** – кандидат исторических наук, доцент, Харьковский национальный педагогический университет имени Г.С. Сковороды.

УДК 303.446.4:27-789.5

**А.У. Літвінскі** (Баранавічы)

# ГІСТОРЫКІ-ЗАХОДНЕРУСІСТЫ АБ ДЗЕЙНАСЦІ ОРДЭНА ЕЗУІТАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ВКЛ

*В статье рассматриваются взгляды представителей западнорусской исторической школы М.О. Кояловича, П.Д. Брянцева, П.М. Жуковича, К.В. Харламповича на деятельность ордена иезуитов на территории Великого княжества Литовского. Обосновывается мысль, что в оценке этой деятельности историками-западноруссами преобладала негативная тональность, связанная с их отрицательным отношением к католицизму.*

Заходнерусізм – уплывовы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. накірунак грамадска-палітычнай і навукова-гістарычнай думкі Расіі і Беларусі. У якасці сваёй асноўнай задачы прыхільнікі дадзенага накірунку разглядалі няспынную барацьбу з польскім і каталіцкім уплывам на землях Беларусі, Літвы і Украіны – землях, якія калісьці ўваходзілі ў склад ВКЛ і якія заходнерусісты лічылі і называлі «Западной Россией». Гістарычную навуку заходнерусісты разглядалі найперш у якасці сродку ідэйна-палітычнай барацьбы. Навукоўцы, якія належалі да разгляданай гістарыяграфічнай школы, у сваіх шматлікіх працах імкнуліся на гістарычных прыкладах прадэманстраваць згубнасць усяго польскага і каталіцкага для лёсу народаў, што ў мінулым складалі насельніцтва ВКЛ.

Асаблівую ўвагу прадстаўнікоў заходнерусісцкай гістарыяграфіі (лідэра гэтага накірунку гістарычнай навукі М.В. Каяловіча, а таксама П.Дз. Бранцава, П.М. Жуковіча, К.В. Харламповіча і іншых) прыцягвалі XVI–XVII ст. Гэты перыяд быў сапраўды лёсавызначальным у гісторыі Беларусі, Літвы і Украіны – дастаткова нагадаць пра Люблінскую міждзяржаўную унію 1569 г. і ўтварэнне Рэчы Паспалітай, а таксама пра

Берасцейскую царкоўную унію 1596 г. Зразумела, дадзеныя падзеі атрымалі адназначна негатыўную ацэнку ў творах гісторыкаў-заходнерусістаў.

Уніяцтва, напрыклад, яны разглядалі ў якасці найбольш яскравай праявы агрэсіўнай каталіцкай экспансіі на тэрыторыі ВКЛ. У гэтым кантэксце не магла застацца па-за ўвагай М.В. Каяловіча, ягоных аднадумцаў і паслядоўнікаў дзейнасць Таварыства Ісуса. Ёй гісторыкі-заходнерусісты надавалі вялізарнае значэнне. Тлумачыцца гэта не толькі і, мабыць, не столькі той сапраўды адметнай роляю, якую адыгралі езуіты ў гісторыі рэгіёна. Справа ў тым, што гэтая дзейнасць у вачах навукоўцаў дадзенага накірунку з'яўлялася найбольш пераканаўчай ілюстрацыяй невыкараняльнай заганнасці каталіцызму («лацінства», паводле распаўсюджанай сярод заходнерусістаў тэрміналогіі).

На думку М.В. Каяловіча, «езуіцтва складае самае лагічнае, непазбежнае развіццё лацінскай сістэмы веры» [3, с. 222] (тут і далей пераклад з рускай мовы наш – **А.Л**.). «Сусветнымі рэакцыянерамі» называў паслядоўнікаў Ігнасія Лаёлы П.М. Жуковіч – вучань М.В. Каяловіча [2, с. 385]. Праўда, настаўнік і вучань у пэўнай ступені па-рознаму расстаўлялі акцэнты пры адказе на пытанне аб прычынах з'яўлення езуітаў на тэрыторыі ВКЛ. М.В. Каяловіч падкрэсліваў, што галоўнай задачай езуітаў была падрыхтоўка царкоўнай уніі. На наш погляд, больш рэалістычную пазіцыю па гэтым пытанні займаў П.М. Жуковіч. Ён лічыў, што тут (як, дарэчы, і на тэрыторыі Польшчы) асноўнай місіяй сяброў Таварыства Ісуса была барацьба супраць Рэфармацыі і пратэстантызму – тая ж самая місія, што і ў іншых рэгіёнах Еўропы [2, с. 93, 94]. Пры гэтым, на думку П.М. Жуковіча, езуітам давялося пераадольваць супраціўленне ўплывовай на той час пратэстанцкай «прарадзівілаўскай» партыі [2, с. 385].

Фактычна паўтараючы адны і тыя ж тэзісы, М.В. Каяловіч, П. Дз. Бранцаў, П.М. Жуковіч даволі маляўніча апісваюць метады езуітаў, асабліва падкрэсліваючы падступнасць і хітрыкі апошніх. Даступныя для наведвання некатолікаў тэатралізаваныя імшы, гарачыя, але дэмагагічныя казанні, рэгулярныя правакацыі ў адносінах да праваслаўных і пратэстантаў, дыспуты з прыхільнікамі Рэфармацыі, а ў выпадку адмовы пратэстантаў ад удзелу ў іх – ілжэдыспуты, на працягу якіх езуіт іграў ролю пратэстанта і цярпеў паражэнне, індывідуальная работа з прадстаўнікамі вярхоў грамадства і адкрыццё навучальных устаноў, але ў той жа час самаахвярная дапамога хворым на чуму ў Вільні – вось так выглядаюць формы дзейнасці сяброў Таварыства Ісуса ў адлюстраванні гісторыкаў-заходнерусістаў [1, с. 70–374; 2, с. 402, 403; 3, с. 221–230].

Зразумела, пералічаныя вышэй дзеянні ацэньваюцца гэтымі навукоўцамі цалкам адмоўна. Аднак пры гэтым яны прызнаюць, што разгляданыя мерапрыемствы далі неабходны езуітам вынік: пазіцыі каталіцызму, якія пахіснуліся пад уздзеяннем Рэфармацыі, пачалі паступова і вельмі ўпэўнена аднаўляцца [2, с. 524–542]. Можна было прыступіць да ажыццяўлення запаветнага плана папства: шляхам заключэння царкоўнай уніі прывесці пад сваю ўладу масы беларускіх і ўкраінскіх «схізматыкаў». Нездарма ж М.В. Каяловіч лічыў, што унія «засноўвалася на падступнасці і ашуканстве» [4, I, с. 128], паколькі была «сагрэтая лацінскім езуіцкім фанатызмам — адным з самых жорсткіх відаў рэлігійнага фанатызму» [4, II, с. 1].

Падрыхтоўка да яе, на думку прадстаўнікоў заходнерусісцкай гістарыяграфіі, спакваля пачалася пры адным з самых, як яны лічылі, «слаўных» каралёў Рэчы Паспалітай Стэфане Баторыі [4, I, с. 44]. М. В. Каяловіч падкрэсліваў, што першапачаткова езуіты, скарыстаўшыся падтрымкай Баторыя, імкнуліся ажыццявіць больш грандыёзныя планы, жадаючы распаўсюдзіць унію на тэрыторыю Расійскай дзяржавы, але гэта ў іх не атрымалася, і таму з яшчэ большым імпэтам яны прыступілі да арганізацыі аб'яднання цэркваў у межах Рэчы Паспалітай [5, с. 194, 195].

Даволі падрабязна прадстаўнікі заходнерусісцкай плыні гістарыяграфіі разглядалі праблему ўзаемадзеяння езуітаў і дзяржаўнай улады ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Пры пэўных рознагалоссях паміж гісторыкамі разгляданага накірунку яны ўсё ж прыходзілі, у прынцыпе, да адзінай высновы: сімбіёз кіруючых колаў гэтых дзяржаў і езуітаў быў узаемавыгадны, паколькі першыя бачылі ў падтрымцы езуітаў магчымасць вырашэння задач унутранай і знешняй палітыкі, а другія імкнуліся выкарыстаць свой уплыў на дзяржаўную ўладу ў мэтах умацавання тут пазіцый каталіцызму [1, с. 381, 386–389; 2, с. 464–508; 3, с. 255; 4, I, с. 39–41; 5, с. 193, 194].

Вядома, якую значную, хаця і супярэчлівую ролю адыгралі езуіты ў сферы адукацыі. Аднак дадзенае пытанне гісторыкі-заходнерусісты краналі мімаходзь, толькі для ілюстрацыі тэзіса аб выкарыстані езуітамі навучальных устаноў, у тым ліку славутай Віленскай езуіцкай акадэміі, для прапаганды ідэй каталіцызму [2, с. 508].

У дадзеным кантэксце выключэннем з агульнага правіла з'яўляецца навуковая творчасць К.В. Харламповіча. Ён якраз займаўся даследаваннем праблематыкі гісторыі адукацыі на землях ВКЛ [6]. Безумоўна, гісторык не мог пакінуць па-за ўвагай працэс станаўлення і развіцця езуіцкай сістэмы адукацыі.

Гэты працэс, на думку К.В. Харламповіча, быў выкліканы неабходнасцю барацьбы з Рэфармацыяй. Паколькі звычайныя каталіцкія школы былі, на погляд гісторыка, «прымітыўнымі» і не маглі эфектыўна выконваць функцыю падрыхтоўкі кадраў для барацьбы супраць рэфармацыйных уплываў, дык і патрабавалася садзеянне езуітаў, каб паставіць справу каталіцкай адукацыі на трывалую аснову [6, с. 23].

Зразумела, навуковец не мог ухіліцца і ад агульнай характарыстыкі Ордэна езуітаў [6, с. 38–41]. Гэтая характарыстыка ў К.В. Харламповіча пазбаўлена залішняй рытарычнасці, так ўласцівай школе М.В. Каяловіча. Больш за тое, у ёй адчуваецца нават прыхаваная павага да сяброў Таварыства Ісуса. «Ордэн езуітаў, – пісаў навуковец, <…> быў вельмі адметнай з'явай у гісторыі ўсяго чалавецтва» [6, с. 38]. Асабліва ён адзначаў самаадданасць езуітаў і прызнаваў, што іх дзейнасць у галіне адукацыі ўзмацніла пазіцыі «рымскай царквы» [6, с. 39].

Гісторык не бачыў непасрэднай сувязі паміж умацаваннем уплыву каталіцызму ў рэгіёне і паланізацыяй «западнорусского» народа і ў гэтых адносінах адрозніваўся ад М.В. Каяловіча. «Езуіцкая школа служыла не народу альбо дзяржаве, а рымскай царкве. Таму адукацыя, якую набывалі ў ёй, насіла больш каталіцка-касмапалітычны характар, чым прыстасаваны да дзяржаўных альбо народных патрэбаў», – сцвярджаў К.В. Харлампові́ч [6, с. 114]. Аднак ад сістэмы езуіцкай адукацыі ён не быў у захапленні і лічыў, што значнае скарачэнне колькасці іншых навучальных устаноў, якое адбылося пад націскам езуітаў, істотна затрымала развіццё асветы ў краі [6, с. 117].

Такім чынам, у ацэнцы дзейнасці езуітаў на тэрыторыі ВКЛ гісторыкамі-заходнерусістамі, відавочна, пераважала негатыўная танальнасць, звязаная з іх адмоўным стаўленнем да каталіцызму. Спробы адыйсці ад выключна адмоўнай характарыстыкі Таварыства Ісуса рабіў хіба што К.В. Харлампові́ч, але і ў яго дадзеная тэндэнцыя выяўлялася не вельмі выразна і непаслядоўна. Працы гісторыкаў-заходнерусістаў садзейнічалі замацаванню ў грамадскай свядомасці стэрэатыпнага ўяўлення пра Ордэн езуітаў як пра сілу, варожую інтарэсам беларускага народа.

*Спіс крыніц і літаратуры*


1. Брянцев, П. Д. История Литовского государства с древнейших времён / П. Д. Брянцев. – Вильна, 1889. – 659 с.
2. Жукович, П. Н. Кардинал Гозий и польская церковь его времени / П. Н. Жукович. – СПб., 1892. – 542 с.
3. Коялович, М. О. Лекции по истории Западной России / М. О. Коялович. – М., 1864. – 348 с.
4. Коялович, М. О. Литовская церковная уния. Исследования / М. О. Коялович. – Т. 1 – 2, СПб., 1859 – 1861. – 316 с. + 443 с.
5. Коялович, М. О. Чтения по истории Западной России профессора М. Кояловича. Новое изд., переработанное и дополненное с 1-го изд. 1864 г. / М. О. Коялович. – СПб., 1884. – 349 с.
6. Харлампович, К. В. Западнорусские православные школы XVI и начала XVII века, отношение их к инославным, религиозное обучение в них и заслуги их в деле защиты православной веры и церкви / К. В. Харлампович. – Казань, 1898. – 525+54 с.



**Літвінскі Аляксандр Уладзіміравіч** – кандыдат гістарычных навук, выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Баранавіцкага дзяржаўнага універсітэта.


Репозиторий БарГУ